

Мурал не пакіне раўнадушным

Як крэатыў дапамагае ратавальнікам

Задача ратавальнікаў не толькі змагацца з наступствамі надзвычайных сітуацый, але і папярэджваць іх. Так, у справе агітацыі за бяспечны спосаб жыцця і цяпер выкарыстоўваюцца звыклыя старыя формы — плакаты, памяткі, брашуры. Яны эфектыўныя і дагэтуль. Але саступаюць у відовішчнасці. Ды і з цягам часу падыходы павінны змяняцца.

Зразумела, што тыя ж школьнікі наўрад ці стануць чытаць кожны дзень памятку ад ратавальнікаў. Ды і не разлічана яна на гэта хоць бы па форме падачы матэрыялу. А вось калі выкарыстаць іншы падыход? Умоўна кажучы, шлях з дому ў школу можа пралягаць праз прыпынак грамадскага транспарту, стылізаванага ў стылі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. На сцяне дома можа быць нанесены вялізнымі лічбамі запаветны нумар «112» ці інструкцыя ў выглядзе графіці, як правільна дзейнічаць пры пажары. Варыянтаў — безліч.

Канешне, такі падыход патрабуе куды большай творчай працы. Але і вынік ад яе ёсць — у краіне з пачатку года загінула на пажары толькі адно дзіця. Такая ж лічба была і год таму.

Напрыклад, зараз у Валожыне праходзіць фестываль графіці: большасць работ скончана, засталіся апошнія штрыхі. Яго ініцыятарамі сталі ратавальнікі, падтрымалі мясцовыя ўлады і іншыя раённыя арганізацыі.

Падрабязней пра фестываль мы распыталі ў **афіцыйнага прадстаўніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Дзіяны ЖАЛЯЗНЯК:**

— Мы ўжо даўно прыцягнулі выяўленчае мастацтва нам у дапамогу. Яркія інфарматыўныя графіці, якія змяшчаюць асноўныя правілы бяспекі, з'явіліся ва ўсіх раёнах Міншчыны. Цяпер іх налічваецца каля сямідзесяці па ўсім рэгіёне. Арт-аб'екты ў стылі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з'яўляюцца сёння ў парках і скверах. Дзясяткі прыпынкаў, аформленых з выкарыстаннем сюжэтаў на тэмы бяспекі, дазваляюць з карысцю бавіць час у чаканні грамадскага транспарту. Нядаўна такі прыпынак з'явіўся ў Смалявічах. Там ён стылізаваны пад пажарны аўтамабіль. Тут наша мэтавая аўдыторыя — дзеці, таму імкнёмся зрабіць каляровую гаму больш насычанай і яркай. Даўно асвоілі і сацыяльную рэкламу.

І вось чарговыя графіці на тэму пажарнай бяспекі з'явіліся ў Валожыне. Трэба сказаць, што тут яшчэ да правядзення фестывалю графіці ўжо былі рэалізаваны два выяўленчыя праекты, заказчыкам якіх выступіла Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Спецыялісты, якія іх стваралі, атрымалі запрашэнне паўдзельнічаць у сёлетнім фестывалі. Мастакі, дызайнеры і архітэктары ініцыятыву падтрымалі.

У горадзе было вызначана некалькі пунктаў для будучых работ. Выбіралі іх паводле наступных крытэрыяў — вялікая плошча і размешчанасць у «прахадным» месцы. Такімі палотнамі сталі велізарная падпорная сцяна і пяць трансфарматарных падстанцый.

— Сюжэты некаторых графіці абстрактныя, — працягвае Дзіяна Жалязняк. — На іх адлюстраваны фантастычныя жывёлы, футурыстычныя пейзажы, дзіўныя птушкі. Цэнтральны ж сюжэт прысвечаны тэме, якая вельмі блізкая ратавальнікам, — малой радзіме. У гэтыя дні на тэрыторыі краіны праходзіць акцыя «За бяспеку малой радзімы», падчас якой ратавальнікі звяртаюцца да жыхароў рэгіёна з заклікам, як казаў паэт, «трэба дома бываць часцей». Аднайменнае графіці размясцілася на падпорнай сцяне плошчай у дзвесце квадратных метраў. Хто ж, акрамя сыноў і дачок, лепш за ўсіх паклапоціцца аб сваіх бацьках? Большасць мастакоў — выхадцы з сельскай мясцовасці. Таму адлюстраваць лірыку сельскіх пейзажаў — хаты, восеньскія кветкі, арнаменты — не склала для іх ніякай цяжкасці.

Увогуле, тэма графіці, прысвечаных бяспецы жыцця, у Беларусі не новая. Першыя такія выявы з'явіліся яшчэ некалькі гадоў таму.

— Спярша мы імкнуліся пераносіць на падпорныя сцены нашы карыкатуры, але з цягам часу асвоілі і іншыя кірункі творчасці, робячы яе ўнікальнай, — працягвае Дзіяна Жалязняк. — Цяпер часцей за ўсё на выявы трапляюць нумары экстранных службаў і маляўнічае графіці «Пяць крокаў выратавання пры пажары». Апошняе найбольш арганічна глядзіцца на глухіх тарцах пяціпавярховых дамоў. Але канчатковае рашэнне аб размяшчэнні таго ці іншага аб'екта прымаюць мясцовыя органы ўлады. Часцей за ўсё нашу творчасць можна ўбачыць у раённых цэнтрах і буйных населеных пунктах.

Таксама пад эгідай Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у цэнтральным рэгіёне з'явілася каля дзевяноста новых дзіцячых пляцовак і арт-аб'ектаў. У ведамстве адзначаюць, што гэта доўгатэрміновая інвестыцыя ў навучанне малых бяспецы. Сярод арт-аб'ектаў прадстаўлены аб'ёмныя кампазіцыі, у тым ліку каваныя, скульптуры. З'явілася ідэя аформіць у стылі МНС і ліхтары. Не засталіся ўбаку і гандлёвыя цэнтры — там ствараюцца тэматычныя дзіцячыя пакоі, прысвечаныя тэме бяспекі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота дадзена МНС.

Сітуацыя

РАМОНТ ІДЗЕ, АЛЕ МАРУДНА

З чым сутыкнуліся жыхары трохпавярховіка пасля пажару ў кватэры

Сітуацыя хоць і пазаштатная, але раз-пораз такія выпадкі ў жыцці здараюцца. Вось і жыхары вёскі Падлабенне Гродзенскага раёна трапілі ў гэты надзвычай непрыемны вір падзей. І прычынай стаў пажар у адной з кватэр. Менавіта яго наступствы вось ужо амаль паўгода пераадольваюць жыхары трохпавярховага шматкватэрнага дома.

Той пажар у красавіку надоўга запомніцца жыхарам дома № 5 па вуліцы Сонечнай. Адвячоркам гарэла кватэра на трэцім, апошнім, паверсе дома. Са слоў Галіны, якая жыве на другім паверсе, увесь лесвічны пралет быў задымлены. Нават з першага паверха нельга было нічога разгледзець, па лесвіцы не было як прайсці. Таму ратавальнікі, як прыехалі, вымушаны былі разбіць вокны ў кватэрах і адтуль прымаць людзей, у тым ліку дзяцей.

Кватэра, дзе ўзнік пажар, можна сказаць, выгарала дашчэнту. Яна і зараз стаіць у тым жа выглядзе, хоць мінула амаль паўгода. Але, як аказалася, гэта яшчэ не самае страшнае. У полымі загінуў і сам гаспадар...

Наступствы пажару адчулі на сабе ўсе жыхары пад'езда. Лесвічныя пралёты былі чорныя, у копаці. У некаторых кватэрах пашкоджаны ўваходныя дзверы. Хоць ацяпленне было адключана, ваду з батарэй не паспелі спусціць. У выніку пажару вада заліла кватэру знізу.

— Паколькі кватэра не была застрахавана, рамонт пасля патопу рабілі ўласнымі сіламі за свой кошт, — патлумачыла гаспадыня кватэры Ліка. — Добра, што аказалі дапамогу па месцы работы.

Але супакойвацца рана. Батарэі ў верхняй кватэры па-ранейшаму пашкоджаны, таму ёсць небяспека, што ў пачатку ацяпляльнага сезона яны зноў пацякуць і наробяць бяды. Дапамагчы можа толькі рамонт альбо іх замена. І зрабіць гэта павінен сын загінулага ўладальніка кватэры — новы ўласнік. Але, па словах жыхароў дома, пакуль ён не робіць ніякіх захадаў, каб выправіць становішча. Увогуле стан згарэлай кватэры яго, відаць, не цікавіць. Дзверы па-ранейшаму не зачыняюцца. А вокны ўстаўлялі на ранейшыя месцы жыхары дома — замест тых, якія былі выбіты падчас работы службы МНС. Яны паведамілі, што мясцовыя ўлады накіравалі ўласніку прадпісанне, каб ён да пачатку ацяпляльнага сезона прывёў у парадак свае батарэі. Інакш будзе складзены адміністрацыйны пратакол.

Трэба сказаць, што ў пад'ездзе амаль усе — уласнікі жылля. Ранейшы трохпавярховік належыў мясцоваму сельгаспрадпрыемству і ў пачатку 90-х будаваўся пад патрэбы гаспадаркі. Па меры выкупу кватэр дом перадалі на баланс ЖКГ. Менавіта яны і павінны цяпер ліквідаваць наступствы пажару. Але — за кошт жыхароў.

— Мы звярнуліся да камунальнікаў з просьбай правесці рамонт, — расказала Галіна. — Да нас прыехала кіраўніцтва жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна, мы ўзгаднілі ўсе работы, якія неабходна правесці, пазней склалі дагаворы і палічылі кошт работ. За рамонт пад'езда атрымалася даволі значная сумма — на кватэру ад 300 да 400 рублёў. Мы пагадзіліся, бо сума будзе раскінута на тры месяцы.

Праўда, пажар быў яшчэ ў красавіку, а вось да рамонту прыступілі толькі ў жніўні. Разам з тым жыхары пагаджаюцца — аб'ём работ аказаўся вялікі. Напачатку трэба было змыць копаць, пабяліць, пафарбаваць сцены. Затое зараз усё вызначаецца чысцінёй і парадкам. Вось толькі такі выгляд не ўсюды. Напрыклад, на першым паверсе не пакладзена плітка, як дамаўляліся з жыхарамі. Тэрмін работ, на думку жыхароў, аказаўся зацягнуты. Планавалася, што рамонт будзе завершаны ў сярэдзіне верасня. Але яшчэ на мінулым тыдні было відавочна, што справа да канца не даведзена. Да таго ж былі выпадкі, калі будаўнікі надоўга пакідалі аб'ект, і яны толькі нядаўна аднавілі работу.

Як патлумачылі ў ЖКГ Гродзенскага раёна, усе работы па бягучым рамонце жыллёвага фонду праходзяць згодна з планамі на вызначаны год. Складваецца графік, тытульны спіс, дзе ўказваецца жылы фонд, які патрабуе рамонту. Гэты спіс сцвярджаецца райвыканкамам. Далей складваецца графік і каштарыс, яны перадаюцца ў жыллёвы аддзел для правядзення тэндара. Хто яго выйграе, той і будзе праводзіць работу. Гэта, бадай, самы працяглы працэс, ён займае некалькі месяцаў. Такі алгарытм работы і па гэтым рамонце.

У дадзеным выпадку сітуацыя нестандартная. У доме планавы рамонт не праводзіўся, хоць за 30 гадоў той яшчэ ні разу не аднаўляўся. Між тым форс-мажорныя абставіны вынеслі будынак па-за межы плана. Ці прадугледжвае ЖКГ падобныя выпадкі? Бо жыхары невінаватыя, што трапілі ў такія абставіны...

Вядома, прадбачыць падобныя здарэнні немагчыма, адзначылі ў раённым ЖКГ. Але жыхары адны са сваёй праблемай застацца не павінны. Таму ў гэтым выпадку ў вёсцы Падлабенне жыллёва-камунальнае прадпрыемства вырашыла дапамагчы людзям і зрабіць бягучы рамонт за кошт уласных сродкаў. Гэта дае магчымасць не праводзіць тэндар і не трапіць пад штрафныя санкцыі. Такім чынам прадпрыемствам зроблены навес над дзвярыма, прыведзены у парадак прыступкі, адрамантавана ўваходная група.

У жыхароў дома № 5 па вуліцы Сонечнай пажар стаў тым фактарам, які паскорыў рамонт. У дадзеным выпадку камунальныя службы знайшлі рэзерв для правядзення работ, а таксама пайшлі на растэрміноўку плацяжоў на тры месяцы. Праўда, ёсць адзін нюанс. Паколькі прэцэдэнт мае адказную асобу — уладальніка кватэры, дзе пачаўся пажар, то ён можа быць прыцягнуты да адказнасці. Ва ўсялякім выпадку, жыхары маюць права звярнуцца ў суд, каб спагнаць з яго выдаткі за рамонт. І, падобна, будуць гэта рабіць.

Нямала пытанняў у жыхароў дома і да падраднай арганізацыі. Чаму, напрыклад, работы вядуцца так марудна? Маўляў, будаўнікі неаднойчы зыходзілі з аб'екта, некалькі разоў пакідалі яго на дастатковa працяглы час. І гэта пры тым, што ўсе работы вядуцца менавіта за кошт уласнікаў і наймальнікаў. Атрымліваецца парадокс: нават сродкі саміх жыхароў не заўсёды спрыяюць ходу справы з капітальным рамонтам, асабліва ў сельскіх населеных пунктах. Правядзенне такіх работ па-ранейшаму застаецца праблематычным.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.